---

1. *Репина, Л. П.* Наука и общество: публичная история в контексте исторической культуры эпохи глобализации / Л. П. Репина // Ученые записки Казанского университета. – Казань, 2015. – Т. 157. – Кн. 3. – С. 55–67.

2. *Ростовцев, Е. А.* Направления исследований исторической памяти в России / Е. А. Ростовцев, Д. А. Сосницкий // Вестн. Санкт-Петерб. ун-та. Сер. 2. – СПб., 2014. – Вып. 2. – С. 106–126.

***В. А. Касап,***
*кандыдат педагагічных навук, дацэнт,*
*загадчык кафедры тэорыі і гісторыі*
*інфармацыйна-дакументных камунікацый*

# ФУНКЦЫІ І СПЕЦЫФІЧНЫЯ РЫСЫ ДАКУМЕНТНЫХ РЭСУРСАЎ БІБЛІЯТЭЧНА-ІНФАРМАЦЫЙНАЙ ТЭМАТЫКІ ЯК ЧАСТКІ ІНФАРМАЦЫЙНЫХ АДУКАЦЫЙНЫХ РЭСУРСАЎ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Тэрмін інфармацыйныя адукацыйныя рэсурсы мае неадназначнае тлумачэнне ў спецыяльнай літаратуры і на старонках і сайтах Інтэрнэт. Часцей за ўсё, гаворачы аб сучасным этапе забеспячэння адукацыйнага працэса ў школе, каледжы ці ўніверсітэце, аўтары карыстаюцца тэрмінамі: лічбавыя адукацыйныя рэсурсы, электронна-адукацыйныя рэсурсы, адукацыйна-інфармацыйныя рэсурсы і інш. Аналіз разнастайных падыходаў да вызначэння паняцця інфармацыйныя адукацыйныя рэсурсы быў праведзены Т.С. Юхнавец [4].

Пад інфармацыйнымі адукацыйнымі рэсурсамі (ІАР) будзем разумець сукупнасць розных па знакавай прыродзе, функцыях, формах доступу дакументаў на розных матэрыяльных носьбітах, якія па сваіх функцыях звязаны з адукацыйнай дзейнасцю, забяспечваюць суб’ектаў адукацыйнага працэсу неабходнай інфармацыяй для транслiравання і засваення ведаў. Да гэтага віда інфармацыйных рэсурсаў неабходна адносіць, па-першае, увесь комплекс вучэбных выданняў як на паперы (падручнікі, вучэбныя дапаможнікі, вучэбна-метадычныя і вучэбна-даведачныя выданні, практыкумы і шэраг іншых). Часта яны маюць электронныя аналагі. Па другое, электронныя вучэбна-метадычныя выданні для падтрымкі адукацыйнага працэсу: элек-

тронныя рэсурсы даведачна-інфармацыйнага характару, сеткавыя электронныя рэсурсы як вучебнае асяроддзе самостойнай работы студэнтаў і інш.; дэманстрацыйныя электронныя рэсурсы; вучебна-гульнёвыя праграмныя сродкі, а таксама некаторыя іншыя. Разам з тым, сучасная сістэма падрыхтоўкі высокакваліфікаваных кадраў немагчыма без выкарыстання навуковай, даведачнай і вытворча-практычнай літаратуры, якая стала класічным рэсурсам сучаснай сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай бібліятэчнай школы.

Для апошняга этапа развіцця вышэйшай і сярэднай спецыяльнай бібліятэчнай адукацыі характэрна выкарыстанне ўсёй разнастайнасці інфармацыйных рэсурсаў: ад традыцыйных элементаў ІАР на паперы рознага мэтавага прызначэння да электронных вучэбна-метадычных комплексаў, электронных тэкстаў лекцый, а таксама рэсурсаў дадатковага характару, якія суправаджаюць працэс набыцця ведаў студэнтаў і навучэнцаў і размешчаны ў рэпазіторыях, на сайтах бібліятэк, у электронных архівах кафедраў і асобных выкладчыкаў: відэапрэзентацыі лекцый, лічбавыя фотаздымкі, відэаматэрыялы, аб’екты віртуальнай рэальнасці, картаграфічныя матэрыялы, гуказапісы і інш. Гэты вялікі пласт інфармацыі неабходна ўлічваць пры азначэнні інфармацыйных адукацыйных рэсурсаў па крытэрыям мноства − падмноства. Можна сцвярджаць, што ІАР − гэта ўся сукупнасць друкаваных і электронных сродкаў, якія даступны выкладчыку для забеспячэння адукацыйнай дзейнасці навучэнцаў. ІАР па бібліятэчна-інфармацыйнай тэматыцы складаюць пэўную сістэму дакументаў, у якой адбываюцца трансфармацыі, замена ці параллельнае існаванне розных яе частак: традыцыйных дакументаў і электронных.

Абапіраючыся на думку Ю. М. Сталярова, што інфармацыйныя рэсурсы − гэта, па сутнасці, дакументы, бо фіксуюць веды на любым матэрыяльным носьбіце [3], і ўлічваючы асаблівасці бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці (поліфункцыянальнасць, інтэгратыўнасць, шырокае выкарыстанне сучасных інфармацыйных тэхналогій і сервісаў, камунікатыўны характар), вызначым спецыфічныя рысы ІАР па бібліятэчна-інфармацыйнай тэматыцы:

– адзінства элементаў, немагчымасць абмяжоўвацца толькі адной іх часткай пры забеспячэнні адукацыйнага працэсу;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– пастаянае папаўненне актыўнай і пасіўнай частак рэсурсаў у сувязі з дзейнасцю дзяржаўных і ведамасных выдавецтваў, стварэннем электронных інфармацыйных рэсурсаў, а таксама іх размяшчэннем у рэпазіторыях бібліятэк;

– захаванасць пры выкарыстанні, магчымасць шматразовага і шматмэтавага выкарыстання (для адукацыйнага працэсу, выхаваўчай і навукова-даследчай дзейнасці студэнтаў);

– розная ступень старэння асобных відаў ІАР: манаграфічная літаратура старэе больш павольна, чым дынамічныя вучэбна-метадычныя комплексы, практыкумы);

– змяненне складу ад традыцыйнай вучэбнай літаратуры да электронных адукацыйных рэсурсаў;

– выкарыстанне новых педагагічных інструментаў для актывізацыі пазнавальнай дзейнасці навучэнцаў: мультымедыйных, інтэрактыўных тэхналогій, якія ўваходзяць у партфоліо кваліфікацыйнага выкладчыка.

Функцыянальная прызначанасць ІАР бібліятэчна-інфармацыйнай тэматыкі цесна звязана з іх каштоўнасцю для забеспячэння асобных працэсаў адукацыйнай дзейнасці, зместам, характарам інфармацыі і інш. З'яўляючыся дакументамі, іх асобныя падсістэмы (тэкставыя, мультымедыйныя, відэаэлементы і г. д.) выконваюць функцыі адукацыйную, сацыялізуючую, прафесійнай адаптацыі, развівальную, выхавальную, каштоўнасна-фарміравальную і інш.

На адной з Крымскіх канферэнцый Т. В. Захарчук быў праведзены аналіз выдання літаратуры па бібліятэчна-інфармацыйнай тэматыцы ў Расіі [3]. Было адзначана, што ў патоку пераважае вучэбная літаратура, якая займае да 40 % ад агульнай колькасці выдадзенай літаратуры дадзенай тэматыкі, далей ідуць манаграфічныя выданні. У Расіі існуе шэраг выдавецтваў, якія звязаны з выданнем літаратуры па гэтай тэматыцы: «Либерея-Бибинформ», «Профессия», «Пашков Дом», «Профиздат» і інш. З мэтай аналіза тэндэнцый выдання айчыннай літаратуры для забеспячэння адукацыйнага працэса былі прааналізаваны бібліяграфічны паказальнік прац выкладчыкаў і супрацоўнікаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў за 2005–2015 гг. [2], а таксама «Кніжны Летапіс» Нацыянальнай кніжнай палаты за гэты ж перыяд.

Аналіз паказаў, што выданні па бібліятэчна-інфармацыйнай тэматыцы выдаюць у рэспубліцы: БДУКМ, выдавецтвы Бела-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

руская навука, Беларуская энцыклапедыя, НББ. Усяго ў «Кніжным летапісе» за перыяд аналізу зарэгістравана каля 40 выданняў, з іх вучэбных – 32. Яны прадстаўлены вучэбнымі і вучэбна-метадычнымі дапаможнікамі. Астатняя літаратура – гэта навуковыя, вытворча-практычныя і даведачныя выданні, у тым ліку, зборнікі навуковых прац. У бібліяграфічным паказальніку [2] сярод выдадзеных за пяцігадовы перыяд прац, бібліятэчна-інфармацыйная тэматыка прадстаўлена ў 133 дакументах (23,6 %). Сярод гэтай колькасці выданняў вучэбная літаратура складае толькі 27 %. Яе відавы склад па характары змешчанай інфармацыі больш разнастайны: уключаны дадаткова метадычныя рэкамендацыі, вучэбна-метадычныя комплексы, метадычныя дапаможнікі. Сярод выданняў невучэбнага характару прадстаўлены 3 манаграфіі, 4 навукова-практычныя выданні, 1 даведачнае выданне. Знайшлі адлюстраванне і навуковыя зборнікі («Беларуская кніга ў кантэксце сусветнай кніжнай культуры») і матэрыялы канферэнцый («Міжнародныя Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні»), дзе значная роля адведзена артыкулам бібліятэчна-інфармацыйнай тэматыцы. Калі ў Расіі адзначаецца, што многія бібліятэчна-інфармацыйныя выданні носяць кан'юнктурны характар, то ў нашай краіне яны скіраваны на актыўнае выкарыстанне ў адукацыйным працэсе.

У XXI ст. змянілася выдавецкая палітыка і патрабаванні да інфармацыйнага забеспячэння адукацыйнай дзейнасці: у выдавецкім патоку з'явіліся вучэбна-метадычныя комплексы, у тым ліку, электронныя, ёсць магчымасць падрыхтоўкі камбінаваных выданняў, якія суправаджаюцца матэрыялам на кампакт дыску, асобныя выданні і інфармацыя аб іх размяшчаюцца ў Інтэрнэце. Але такія магчымасці пакуль выкарыстоўваюцца недастаткова. Адукацыйнаму працэсу не хапае сапраўдных электронных падручнікаў і тэставых сродкаў, манаграфій па актуальных праблемах бібліятэчнай тэорыі. Па-ранейшаму запатрабаваны тлумачальныя і тэрміналагічныя слоўнікі бібліятэчна-інфармацыйнай лексікі. Адной з невырашаных пакуль праблем бачыцца несфарміраванасць шматузроўневай сістэмы вучэбных выданняў для сярэдняй і вышэйшай бібліятэчнай адукацыі з рознай методыкай падачы матэрыяла і напаўняльнасцю.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. *Захарчук, Т. В.* Подготовка актуальных изданий для библиотечно-информационной сферы: опыт петербургской библиотечной школы и издательства «Профессия» / Т. В. Захарчук. – Режим доступа : //http: www gpntb.ru/win/inter-events/crimea 2003/…/doc31.html. – Дата доступа : 8.09.2016.

2. Обращаясь к старому, открывать новое... : труды преподавателей и сотрудников Белорусского государственного университета культуры и искусств, 2005 – 2015 гг. : библиографический указатель / Белорус. гос. ун-т культуры и искусств ; сост.: Е. М. Приходько, Т. В. Ишутина. – Минск : БГУКИ, 2015. – 182 с.

3. *Столяров, Ю. Н.* Документный ресурс : учеб. пособие / Ю. Н. Столяров. − М. : Либерея, 2001. − 152 с.

4. *Юхнавец, Т. С.* Адукацыйныя інфармацыйная рэсурсы: да пытання вызначэння сутнасці / Т. С. Юхнавец // Весн. Беларус. дзярж. ун-та культуры і мастацтваў. – 2014. – № 2. – С. 103–110.

***І. П. Клімаў,***
*кандыдат філалагічных навук,*
*дацэнт, дацэнт кафедры беларускай*
*філалогіі і сусветнай літаратуры*

# СПЕЦЫФІКА РЭЛІГІЙНАГА СТЫЛЮ Ў МОВЕ

У сучаснай лінгвістыцы (ва ўсялякім выпадку, у славянскіх краінах) няма згоды ці хаця б кансенсусу ў справе вылучэння такой з'явы, як рэлігійны стыль. Яшчэ зусім нядаўна пра такі стыль не згадвала ніводная тыпалогія функцыянальных стыляў не толькі ў Беларусі, але і ў Расіі ці Польшчы, як і ў іншых славянскіх краінах [4, с. 21]. Доўгі час з'явы, звязаныя з рэлігіяй, там не маглі вольна даследавацца як асобны аб'ект з-за цэнзурных і ідэалагічных забарон. Толькі ў 1990-я гг. у славянскіх краінах з'явіліся працы, дзе вядзецца гаворка пра рэлігійны стыль ці робіцца спроба яго дэфінаваць або апісаць. Аднак гэтае пытанне ўсё яшчэ застаецца адкрытым. Пры гэтым у некаторых працах рэлігійны стыль называецца інакш: «кафесійны», «царкоўны», «багаслужбовы», «казнадзейскі» («прапаведніцкі») і да т. п. [2; 3, с. 287; 4, с. 22–28; 1, с. 10–12], што адлюстроўвае як неўсталяванасць тэрміналогіі, так і істотныя разыходжанні даследчыкаў у вызначэнні сутнасці з'явы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ